Аграпрамбанку выдзеліць для гэтых мэт сельскагаспадарчым прадпрыемствам, прадпрыемствам камбікормавай прамысловасці крэдыты, а таксама прадоўжыць да кастрычніка 1993 г. тэрмін пагашэння крэдытаў, выдзеленых сельскагаспадарчым прадпрыемствам для правядзення веснавых пасяўных работ.

6. Міністэрству хлебапрадуктаў зрабіць выплату гаспадаркам авансу ў размеры 30 працэнтаў кошту травяной мукі, прадугледжанай да пастаўкі імі па дагаворах прадпрыемствам камбікормавай прамысловасці.

Міністэрству хлебапрадуктаў, Міністэрству сельскай гаспадаркі і прадуктаў харчавання па ўзгадненню з Міністэрствам фінансаў і Аграпрамбанкам распрацаваць парадак і ўмовы правядзення ўказаных выплат і канчатковага разліку з гаспадаркамі за прынятую ад іх травяную муку.

7. Камітэту па нафце і хіміі пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь сумесна з Міністэрствам сельскай гаспадаркі і прадуктаў харчавання на працягу 1993 года прыняць меры да арганізацыі вытворчасці ў рэспубліцы поліпрапіленавага шпагату або яго заменніка.

8. Дзяржэканамплану, Міністэрству сельскай гаспадаркі і прадуктаў харчавання, Міністэрству хлебапрадуктаў, Дзяржаўнаму камітэту па знешніх эканамічных сувязях, Міністэрству фінансаў, Міністэрству рэсурсаў з улікам ацэнкі аб'ёмаў нарыхтоўкі травяных кармоў, ураджаю збожжавых культур, а таксама чакаемага фарміравання дзяржаўных рэсурсаў збожжа на харчовыя і кармавыя мэты да 1 верасня 1993 г. унесці ў Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь прапановы аб закупцы за межамі рэспублікі неабходнай колькасці збожжа, шротаў, прэміксаў, іншых кармавых дабавак і аб крыніцах фінансавання гэтых закупак.

9. Міністэрству сельскай гаспадаркі і прадуктаў харчавання, Міністэрству фінансаў распрацаваць і давесці да ведама зацікаўленых умовы эканамічнага стымулявання і заахвочвання сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, незалежна ад форм уласнасці, раёнаў і абласцей за найбольш поўнае забеспячэнне жывёлагадоўлі травянымі кармамі ў 1993 годзе, адшукаўшы для гэтага неабходныя сродкі.

10. Міністэрству інфармацыі сумесна з Міністэрствам сельскай гаспадаркі і прадуктаў харчавання арганізаваць рэгулярныя тэле- і радыёперадачы і публікацыі ў газетах і часопісах, якія б асвятлялі ход нарыхтоўкі кармоў, укараненне ў іх вытворчасць сучасных прыёмаў і тэхналогій, шырока прыцягваючы для гэтага вучоных, кіраўнікоў і спецыялістаў гаспадарак, перадавікоў вытворчасці.

11. Дзяржкамстату забяспечыць прадстаўленне міністэрствам, ведамствам і іншым зацікаўленым штотыднёвай інфармацыі аб ходзе касьбы і нарыхтоўкі кармоў.

12. Міністэрству сельскай гаспадаркі і прадуктаў харачавання прадставіць да 1 снежня 1993 г. Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь інфармацыю аб выкананні гэтай пастановы.

**Старшыня Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь В.КЕБІЧ.**

**Кіраўнік спраў Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь М.КАЎКО.**

28 мая 1993 года.
г.Мінск.
№ 349

---

*З афіцыйных крыніц*

## Несуцяшальная карэкціроўка

Як нам стала вядома, Дзяржэканампланам сумесна з міністэрствамі і ведамствамі, прадпрыемствамі і арганізацыямі праведзена карэкціроўка эканамічнай праграмы на 1993 год. Яна выклікана аналізам удакладненай базы 1992 года, вынікамі I квартала бягучага года, а таксама рэальнай ацэнкай будучага рэсурснага забеспячэння, збыту гатовай прадукцыі, дынамікай цэн.

Валавы нацыянальны прадукт у выніку вызначыўся на ўзроўні 92,5 працэнта да 1992 года (па зацверджанай раней праграме — 96,8), выраблены нацыянальны даход прагназіруецца ўсяго в 91,6 працэнта, а не 96.2, як раней.

У прамысловасці зніжэнне вытворчасці можа складаць прыкладна 10 працэнтаў (у ранейшым варыянце 5,5 працэнта), у тым ліку ў паліўнай прамысловасці — 16,7 (2,4), у хімічнай і нафтахімічнай — 15 (8), прамысловасці будаўнічых матэрыялаў — 14 працэнтаў замест плануемых 2.

У сувязі з сыравіннымі праблемамі і цяжкасцямі са збытам прадукцыі будуць зменшаны аб'ёмы паставак для дзяржаўных патрэб валокнаў хімічных штучных, ніцей хімічных тэкстыльных, школьнага абсталявання, каларыфераў і порыстых напаўняльнікаў.

У сельскай гаспадарцы ўдакладнены аб'ёмы валавай прадукцыі. Рост да ўзроўню мінулага года вызначыўся ў размеры 0,8 працэнта замест раней намечаных 4,5.

Разліковы аб'ём капітальных укладанняў за кошт усіх крыніц фінансавання складзе 81 працэнт да ўзроўню 1992 года, а не 97,8 закладзеных у праграме. Гэта звязана са зніжэннем інвестыцыйных магчымасцей прадпрыемстваў.

У сувязі з удакладненнем базы мінулага года выпуск тавараў народнага спажывання пры захаванні аб'ёму, які намячаўся ў праграме, не будзе мець прыросту. Нагадаем, што першапачаткова ён прадугледжваўся ў памеры 3,2 працэнта.

Удакладнена пастаўка тавараў для дзяржаўных патрэб па 7 пазіцыях нехарчовых тавараў (з 92) і па 2-х — харчовых (з 20).

Удакладнены асобныя паказчыкі па сацыяльнай сферы, у прыватнасці памер сярэднямесячнай заработнай платы рабочых і служачых. Яна вырасце ў параўнанні з 1992 годам амаль у 9 разоў і складзе 43543 рублі ў месяц. Інфляцыя!

Дзяржэканамплан папярэджвае: пры неабходнасці ў эканамічную праграму будуць ўносіцца дадатковыя карэктывы. Думаем, што не ў бок павелічэння.

Здаецца, праўду гаварыла ў свой час Ала Пугачова: ці тое яшчэ будзе. Ой-ёй-ёй!

**Ігнат КРЭМЕНЬ.**

НАРОДНАЯ ГАЗЕТА

# ЗАМЕЖЖА

* ІТАР-ТАСС * НАРОДНАЯ ГАЗЕТА *

## Пульс дня

**У Пецярбургу дэмакраты святкуюць. Камуністы бастуюць**

**Песні, музыка, тосты за веліч горада Пятрова і Расіі не сціхалі ўчора і пазаўчора ў Таўрычаскім палацы, дзе праходзіла святочная асамблея, прысвечаная 290-годдзю Санкт-Пецярбурга.**

Гасцей павіншавалі са святам мэр Анатоль Сабчак, іншыя кіраўнікі горада і вобласці. З цеплынёй успаміналі пра гады свайго жыцця і вучобы тут прэзідэнт Кыргызстана Аскар Акаеў. Прэм'ер-міністр Эстоніі Март Лаар выказаў надзею, што Пецярбург, які стаў у свой час для Расіі "акном у Еўропу", цяпер стане для Эстоніі "акном у Расію".

Нельга не ўпамянуць і аб тым, што гасцей, якія з'язджаліся на асамблею, сустракала каля варот Палаца група пікетчыкаў пад чырвонымі сцягамі. Пікетчыкі не абмяжоўваліся адной толькі дэманстрацыяй антыпрэзідэнцкіх і антыўрадавых плакатаў. Асабліва ж дасталося буйному пецярбургскаму прадпрымальніку Ілью Баскіну, якога пікетчыкі з-за яго вусоў прынялі за Сяргея Шахрая. Бізнесмен нават пажартаваў, што ў наступны раз, каб не выйшла памылкі, ён прымацуе да грудзей шыльдачку "Руцкой".

**Перамір'е парушана**

**Адна з груповак афганскіх маджахедаў ажыццявіла напад на армейскае падраздзяленне, парушыўшы тым самым спыненне агню, якое працягвалася тыдзень.**

Аб гэтым паведамляе агенцтва Рэйтар з Кабула са спасылкай на заяву прадстаўніка міністэрства абароны Афганістана.

**Няма "Саветаў" — няма сакрэтаў?**

**Адміністрацыя Клінтана распарадзілася падрыхтаваць поўнае даследаванне пытанняў, звязаных з працэдурай засакрэчвання інфармацыі ў Міністэрстве абароны і ЦРУ.**

Віцэ-прэзідэнт ЗША Альберт Гор заявіў, што мэта новага даследавання — "пазбавіцца ад непатрэбнай бюракратыі, выявіць магчымасці сур'ёзнай эканоміі сродкаў і павысіць эфектыўнасць" дзейнасці ўрада ў забеспячэнні сакрэтнасці інфармацыі. Паводле афіцыйных даных, толькі ў мінулым годзе было засакрэчана прыкладна 19 мільёнаў старонак рознай дакументацыі.

**Радыкал — слова лаянкавае**

**Паліцыя перашкодзіла вылазцы праварадыкальных сіл у Дрэздэне.**

Яны мелі намер ажыццявіць марш да гарадскіх могілак, на якіх два гады назад быў пахаваны неанацысцкі завадатар Райнер Зонтаг. Паліцэйскія ўлады забаранілі правым экстрэмістам праводзіць любыя дэманстрацыі. Другая група праварадыкальнай моладзі спрабавала наладзіць правакацыю ў час мітынгу, праведзенага перад дрэздэнскай ратушай па закліку сацыял-дэмакратычнай партыі Германіі, іншых партый. Некалькі чалавек затрыманы паліцыяй.

**Ганконгцы не хочуць камуністычнага раю**

**Каля 3.000 ганконгцаў прынялі ўдзел у дэманстрацыі з выпадку 4-й гадавіны падаўлення студэнцкіх выступленняў на пекінскай плошчы Цяньаньмэнь.**

Яны скандзіравалі заклікі да ўстанаўлення дэмакратыі ў Кітаі, часткай якога праз некалькі гадоў павінен стаць Ганконг, вызвалення актывістаў руху за дэмакратызацыю. Дэманстранты прайшлі маршам каля 5 кіламетраў да будынка, дзе знаходзіцца аддзяленне кітайскага інфармацыйнага агенцтва Сіньхуа, якое адыгрывае ролю афіцыйнага прадстаўніцтва КНР у Ганконгу.

**Правячая партыя ўмацуе свае пазіцыі**

**Правячая Народная партыя Камбоджы на чале з прэм'ер-міністрам Хун Сенам мае ўсе шанцы канчаткова замацаваць сваё лідэрства ў ходзе падліку галасоў, які праводзіцца пасля ўсеагульных выбараў, якія адбыліся ў гэтай краіне 23—28 мая.**

З такім прагнозам выступіла японскае агенцтва Кіода Цусін на падставе праведзенага ім аналізу тэндэнцый, якія ўжо выявілі работнікі выбарчай камісіі, якая дзейнічае пад кіраўніцтвам Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.

**Кінь цыгарэту!**

**З заклікам устрымацца ад курэння звярнулася да ўсіх курцоў свету Сусветная арганізацыя аховы здароўя (СААЗ).**

Па традыцыі 31 мая яна правяла "Сусветны дзень без табаку", мэта якога — прыцягнуць увагу сусветнай грамадскасці да цяжкіх вынікаў згубнай прывычкі для здароўя. Прыхільнасць да тытуню штогод каштуе жыцця тром мільёнам людзей, гаворыцца ў апублікаваным камюніке. Курэнне — прычына 30 працэнтаў усіх ракавых захворванняў, 80 працэнтаў выпадкаў хранічнага бранхіту, 20—25 працэнтаў сардэчна-сасудзістых хвароб.

## Сіндром хворых будынкаў

**Памяшканні з кандыцыянерамі і шчыльна зачыненымі вокнамі даўно карыстаюцца рэпутацыяй "нездаровых". Але як сведчыць апытанне адной тысячы чалавек, якое правёў муніцыпалітэт Йаханесбурга, праветрываемыя натуральным чынам канторы, магчыма, нават больш падвержаны так званаму сіндрому хворых будынкаў.**

Лічыцца, што будынак "хварэе", калі звыш 20 працэнтаў людзей, якія ў ім знаходзяцца, адчуваюць адны і тыя ж непрыемныя сімптомы, а па-за ім іх стан паляпшаецца. Згодна з даследаваннем муніцыпалітэта, служачыя кандыцыяніраваных офісаў пераўзышлі насельнікаў збудаванняў папярэдняга пакалення па колькасці скаргаў на рэзь у вачах і асабліва млявасць. Затое іх "апаненты" намнога часцей пакутуюць ад павышанай стомленасці, галавакружэння, алергічных прастуд. Значна большая сярод іх колькасць тых, каго непакоіць раздражненне скуры і сухасць у горле. Зрэшты, арганізатары апытання робяць папраўку на тое, што ў будынках без сучасных прыстасаванняў ахаладжэння і цыркуляцыі паветра вышэйшы працэнт асоб са сціплым дастаткам, у якіх шырэй кола прычын для дрэннага самаадчування.

Доктар Ясмін фон Шырндзінг, якая займаецца ў муніцыпалітэце праблемамі ўплыву навакольнага асяроддзя на здароўе людзей, мяркуе, што "сіндром хворых будынкаў" выклікаецца ў першую чаргу забруджаннем паветра ўнутры памяшканняў. У прыватнасці, шкодныя выпарэнні ад сінтэтычных матэрыялаў, пластмас, новай мэблі. Атручваюць паветра памнажальныя апараты, часам азбест. Адбіваюцца на гэтым накапленне бактэрый і грыбкоў у вентыляцыйнай сістэме, недастатковае праветрыванне пакояў ці кабінетаў.

Але на першым месцы сярод усіх негатыўных фактараў стаіць курэнне. Тры чвэрці апытаных людзей, якія не кураць, заявілі, што для іх зусім не бяскрыўдныя зацяжкі таварышаў па службе ў рабочы час на рабочых месцах. Небяспеку тояць у сабе і жылыя дамы. Напрыклад, старыя збудаванні, сцены якіх пакрыты фарбай, якая ўтрымлівае свінец. Калі фарба аблазіць, паветра напаўняецца шкоднымі для людзей часціцамі.

Будынкі, аднак, паддаюцца "лячэнню". Галоўнае — устанавіць дыягназ. А пазбаўляць іх ад хвароб не толькі неабходна, але і выгадна, лічыць Шырндзінг. Бо той, каму свабодна дыхаецца, радзей хварэе, заўсёды на рабоце і з вялікай аддачай працуе, калі практычна здаровы.

**Аляксандр ПРАСВЕТАЎ.**

*Журналист "Народной газеты" вернулся из-за границы. Что он там увидел?*

# I. Швейцария знакомая и незнакомая

**Владимир САМОЙЛОВ**

*Может быть, я и ошибаюсь, но мне кажется, что Швейцария для нас всегда была "terra incognita". Хотя города ее —Женева, Лозанна, Локарно — служили постоянными декорациями для грандиозных исторических драм, мы практически ничего не знаем о повседневной жизни этой страны, представляя ее в основном как средоточие банков и часовых заводов. Ну, еще кое-кто помнит запах швейцарского сыра, правда,кажется, он был, собственного производства.*

*Сегодня все чаще наши взоры обращаются к этой стране, как к примеру для подражания. Наша, также небольшая республика выбрала путь суверенитета и независимости, и в парламенте, и на улице теперь можно услышать: ну, почему бы и нам не стать восточноевропейской Швейцарией? И по размеру Беларусь примерно такая же, и по структуре экономики, и даже отсутствием больших запасов полезных ископаемых мы схожи.*

*В самом деле, а почему бы нам и не поучиться? Ведь, думается, тайны процветания этой независимой и гордой страны не спрятаны на дне самых секретных швейцарских сейфов, а находятся где-то в области сердец этих людей, уважающих больше всего на свете свои человеческие права.*



Сразу оговорюсь, рассказ мой будет не о всей Швейцарии, а только о северной ее части, где проживает немецкоязычное население. Но именно эта часть страны, далекая от политических событий и экономически наиболее развитая, мне кажется, и представляет наибольший для нас интерес. Тем более что приехали мы сюда по приглашению правительства кантона Аргау, которое приняло решение провести в июне этого года Дни Швейцарии в Беларуси.

Но сначала буквально несколько слов об истории.

В отличие от нашей республики, декларировавшей свой суверенитет совсем недавно, Швейцария несколько лет назад праздновала 700-летие своей независимости. Правда, нельзя сказать, что все эти семь столетий она действительно была полностью суверенной — вначале находилась под властью Священной Римской империи, зависела от австрийских Габсбургов, было время, когда Наполеон диктовал ей свои условия, — и тем не менее стаж самостоятельности у нее действительно внушительный.

Создавалась она по кусочкам, как шьют из лоскутков домашний ковер. В 1291 году объединились всего три кантона — Ури, Швиц и Ундервальден, потом к ним стали присоединяться другие земли — сейчас страна состоит из 26 кантонов, в каждом свой парламент и правительство, свои полицейские силы и административные органы. И, конечно же, свой флаг. Насчет гимна, честно признаюсь, не знаю. Но в результате швейцарский "лоскутный ковер" получился и красивым и прочным.

Прочным, несмотря на то,что объединяет он людей, которые по языку принадлежат к разным, но великим культурам. Большая часть населения — почти 75 процентов — говорит на немецком, на французском — пятая часть, совсем небольшая — на итальянском, около одного процента — на исконно швейцарском — ретороманском. Интересно, что хотя последний также является государственным, он даже не имеет письменного оформления. Как нам пояснили, в одной деревне пишут так, в соседней — по-иному. Но никому это зла не приносит.

— Отмечая 700-летний юбилей, —говорил на празднике министр экономики Марко Солари, — мы не должны обращаться мыслями к прошлому, потому что легенды и мифы не дают никаких ответов. На этом рубеже перед нами встают два сложных вопроса: кто мы, куда мы идем?

Швейцария дала миру много великих имен. Это церковные реформаторы Кальвин и Цвингли, мыслители Жан-Жак Руссо и Песталоцци, писатели Дюрренматт и Фриш. Впрочем, швейцарцы имели обыкновение разбредаться по всему свету, а в Швейцарии предпочитали жить люди со всего света. Те, конечно, у кого были деньги. Российское дворянство издавна облюбовало швейцарские курорты. Здесь подолгу жили Карамзин, Гоголь, Достоевский, Герцен, Толстой и вождь мирового пролетариата В.И.Ленин.

В наших библиотеках о Швейцарии можно найти едва ли два-три небольших издания, но в каждом из них с особой гордостью отмечается, что кроме подписания всевозможных мирных договоров после мировых и иных войн, кроме созыва международных конференций, в Швейцарии проходили и встречи социалистов-интернационалистов, где главную скрипку играли российские большевики. Думается, и в этом есть одна из отличительных черт швейцарского колорита: здесь всегда были терпимы ко всякого рода политическим течениям, выбирая при этом для себя золотую середину.

**Фото автора**

## Вам збіраюцца паказаць...

### "Яр"

Так называецца каляровая двухсерыйная мастацкая кінакарціна, знятая кінамайстрамі расійска-амерыканскага сумеснага прадпрыемства "Соўаўта-кэпітал" і фірмы "Рэрых". У аснову сцэнарыя, напісанага Усеваладам Івановым, лягла аднайменная аповесць Сяргея Ясеніна. Паставіў фільм рэжысёр Хабіб Файзіеў.

Яр — запаведны лес паблізу Тулы. У дапятроўскі час размяшчалася тут вялікае сяло, жыхары якога і зямлю абраблялі, і з жалезам умелі працаваць, ружжы ды пісталеты рабіць. Аднойчы з'явіўся ў сяле майстар-збройнік Канстанцін Караў. Яму, былому салдату, які шмат перажыў і пабачыў на сваім вяку, даспадобы былі тутэйшыя мясціны. Ён пасяліўся на млыне ў адзінокага старога Афоні, ачысціў ваду, запусціў жорны. Стаў Караў старому як родны сын, і той, паміраючы, пакінуў яму сваю гаспадарку і сабраныя на будаўніцтва царквы грошы. Ды толькі Караў парушыў абяцанне, дадзенае Афоню: пусціў грошы на пабудову машыны, пры дапамозе якой можна было свідраваць дулы для ружжаў. Як быццам прадчуваў, што ў хуткім часе, у наступаючым XVIII стагоддзі, Расіі спатрэбіцца вельмі шмат ружжаў...

У галоўных ролях выступаюць Леў Дураў, Леанід Кулагін, Ірына Шаўчук, Лідзія Вележава і іншыя.

### "Чорны квадрат"

Карціна створана сумесна кінематаграфістамі Маскоўскай кінастудыі імя М.Горкага, творчага аб'яднання "Шанс", АА "Паўднёвы рэгіён холдзінг", АА "Герніка" і ФТМ "Інтэртэйнмент лімітэд". Паставіў яе рэжысёр Юрый Мароз паводле свайго сцэнарыя, у аснову якога лёг дэтэктыўны раман Фрыдрыха Нязнанскага "Кірмаш у Сакольніках". Чвэрць стагоддзя адпрацаваўшы ў органах юстыцыі, гэты пісьменнік у 1977 годзе эмігрыраваў на Захад, дзе праславіўся як літаратар. Сюжэты раманаў Нязнанскага заснаваны ці то на яго ўласных справах, ці то ягоных тагачасных савецкіх калег.

Запамінаецца ігра вядомых акцёраў, занятых у фільме, — Віталя Саломіна, Дзмітрыя Харацьяна, Алены Якаўлевай, Васіля Ланавога, Эмануіла Вітаргана, Армэна Джыгарханяна.

### "Майстар Усходу"

Гэту каляровую мастацкую кінакарціну перадаюць на суд гледачоў кінамайстры МПЦ "Дагмас" і агенцтва "Папуляр". Сцэнарый напісалі Аляксандр Казакоў і Людміла Казакова, рэжысёр-пастаноўшчык — Аляксандр Казакоў.

Фільм перапоўнены эфектнымі сцэнамі ўсходніх адзінаборстваў, добра пастаўленых сутычак, якія самі па сабе — захапляючае відовішча для аматараў баявых мастацтваў, але не як віду спорту, а як часткі філасофіі духу...

Галоўныя ролі выконваюць Алег Штэфанка, Інара Слуцка, Эрнст Раманаў, Анатоль Гузенка і інш.

### "Геніяльная ідэя"

Вытворчасць кінастудыі "Фора-фільм". Аўтар сцэнарыя — Міхаіл Каломінскі, рэжысёры-пастаноўшчыкі — Андрэй Разумоўскі і Сяргей Ускоў.

Дзея гэтай камедыі адбываецца ў маленькім курортным гарадку ў разгар сезона. Таня і яе новы знаёмы Саша — маладыя і поўныя сіл, але яднае іх не адпускны флірт, як натуральна было б здагадвацца, а далёка не рамантычная акалічнасць — поўная адсутнасць грошай. Галодны бляск у вачах Сашы робіцца стымулам для нараджэння ў Танінай галаве геніяльнай ідэі: ашалелых ад правінцыяльнага суму грашавітых мужыкоў тут вялікае мноства, а значыць, можна быць калі не багатым, дык ва ўсялякім разе не галодным. Зрабіць гэта вельмі проста: Таня прыводзіць да сябе ў нумар "кліента", той мітусіцца з пачастункам, бутэлькай шампанскага, прадбачачы далейшае развіццё падзей, а ў самы разгар піравання з грозным выглядам з'яўляецца "муж" Сашa...

У фільме здымаліся Марыя Зубарава, Васіль Мішчанка, Таццяна Васільева, Іосіф Хаіндрава.

Кадр з фільма "Яр".

## Пасля падзеі

**Два з'езды адбыліся ў мінулыя выхадныя ў Мінску. Два шляхі развіцця Беларусі абмяркоўваліся на грамадска-палітычным і партыйным форумах. І ў тэатры імя Янкі Купалы, і ў інфармацыйна-культурным цэнтры Савета Міністраў сабраліся перакананыя ў сваіх поглядах людзі. І там, і там дэлегаты з'ездаў былі ўпэўнены, што толькі яны прывядуць сваіх суграмадзян да шчаслівага жыцця.**

**Чыя ідэя пераможа? Безумоўна, толькі тая, якую падтрымае народ. Сёння БНФ і ПКБ з'яўляюцца найбольш вядомымі і актыўнымі палітычнымі сіламі на Беларусі, а мэты ў іх фактычна супрацьлеглыя. І тое, што яны правялі свае з'езды адначасова і зусім побач, толькі падкрэслівае, што галоўная барацьба ў іх яшчэ наперадзе.**

### Свой выбар зробіць народ

**Сяргей ПАЛЯШУК**

— Сімвалічна, што праз семдзесят пяць гадоў мы сабраліся ў будынку, у якім у 1918 годзе першы беларускі кангрэс абвясціў Беларускую Народную Рэспубліку. Няхай вас не засмучае, што ўсім не хапае месца, што многім дэлегатам і гасцям прыходзіцца сядзець на балконах, а некаму нават стаяць. Няхай гэтыя сцены, гэты будынак, які памятае галасы тых нашых продкаў, спрыяе і дапамагае нашай працы! — такімі словамі адкрыў III з'езд Беларускага народнага фронту яго старшыня народны дэпутат Беларусі Зянон Пазьняк.

566 дэлегатаў з усіх абласцей рэспублікі прыехалі на з'езд. Яны выслухалі даклад старшыні БНФ і справаздачу рэвізійнай камісіі, прынялі актыўны ўдзел у абмеркаванні новай праграмы БНФ.

Многія дэлегаты і госці з'езда адкрыта гаварылі, што прыйшоў час сур'ёзна думаць аб канстытуцыйнай барацьбе за ўладу ў рэспубліцы, што трэба рыхтавацца да новых выбараў і прыкласці ўсе намаганні, каб на іх перамагчы.

Менавіта з гэтай мэтай у рамках III з'езда БНФ адбыўся і ўстаноўчы з'езд партыі БНФ. Неабходнасць такога кроку растлумачыў дэлегатам старшыня БНФ Зянон Пазьняк: у апошні час актывізавалася дзейнасць рэакцыйных сіл і можа так здарыцца, што цяперашні Вярхоўны Савет прыме законы, якія не дазволяць удзельнічаць у выбарах, іншых палітычных кампаніях грамадска-палітычным рухам. Таму мы павінны мець юрыдычны парасон над нашым рухам і стварыць партыю БНФ. Але, ствараючы такую партыю, мы павінны прадугледзець усё, каб не ўнесці раскол у БНФ. БНФ, як быў, так і павінен застацца шырокім грамадска-палітычным народным рухам.

Дэлегаты з'езда БНФ падтрымалі прапанову сойма. Партыя БНФ створана, прыняты яе статут, старшынёй ПБНФ абраны Зянон Пазьняк. Ён жа застаўся і старшынёй Беларускага народнага фронту.

Дэлегаты III з'езда БНФ зацвердзілі таксама новую праграму Беларускага народнага фронту, прынялі ўхвалы "Пра становішча на Беларусі", "Пра ўсенародны рэферэндум", "Пра Канстытуцыю Беларусі" і іншыя.

З'езд закончыўся. Ці ажывяць прынятыя на ім рашэнні дзейнасць мясцовых арганізацый БНФ, ці павялічыцца пасля яго колькасць прыхільнікаў руху, пакажа час. А выбары, якія таксама ўжо не за гарамі, пакажуць, ці прыняў наш народ новую праграму БНФ, ці вырашыў ісці ўслед за лідэрамі новай партыі і грамадска-палітычнага руху...

**Ларыса КЛЮЧНІКАВА, Белінфарм**

### Партыя новая — лозунгі старыя

29—30 мая ў Мінску ў інфармацыйна-культурным цэнтры Савета Міністраў прайшоў 2-і з'езд ПКБ. 18 тысяч беларускіх камуністаў былі прадстаўлены 543 дэлегатамі, з якіх 290 чалавек удзельнічалі ў 32-м з'ездзе КПБ. Выступіўшы са справаздачным дакладам сустаршыня палітвыканкама ПКБ Анатоль Лашкевіч сказаў, што Віскулі прывялі да гібелі вялікай дзяржавы. Ён таксама адзначыў, што антыкамуністычны "хор" крыху змоўк пасля святкавання 75-й гадавіны Кастрычніка. На з'ездзе было заяўлена, што парламентарызм і прэзідэнцтва з'яўляюцца атрыбутамі буржуазнага ладу, а дырэктарскі корпус рэспублікі праводзіць капіталізацыю. На наступных выбарах лозунг камуністаў ранейшы — "Уся ўлада Саветам".

У кулуарах з'езда быў распаўсюджаны зварот ініцыятыўнай групы членаў КПБ і ПКБ, у якім, у прыватнасці, адзначана, што "раскол КПБ як арганічнай часткі камуністычнага руху можа адкрыць дарогу сацыял-дэмакратычнаму перараджэнню і нацыянал-камунізму". Ініцыятыўная група патрабавала абвясціць 2-і з'езд ПКБ адзіным з'ездам кампартыі Беларусі, аднак большасць дэлегатаў не падтрымалі гэту пазіцыю.

У эканамічным раздзеле прынятай праграмы прыярытэтам названа грамадская ўласнасць. Сфарміраваны кіруючыя органы партыі. Сярод сямі сакратароў ЦК у ЦК увайшлі 54 чалавекі, з іх 5 — дэпутаты Вярхоўнага Савета — лідэр фракцыі ў Вярхоўным Савеце Рэспублікі Беларусь Міхаіл Качан. Разглядаліся кандыдатуры Валерыя Ціхіні, былога сакратара ЦК КПБ, і былога сакратара РКП Івана Антановіча, але яны ўзялі самаадвод. Па патрабаванню дэлегатаў з'езда абмеркаванне кандыдатур праходзіла пры адсутнасці прадстаўнікоў прэсы.

Як заявіў карэспандэнту Белінфарма сакратар ЦК ПКБ Віктар Чыкін, "з'езд адлюстраваў рэальнае становішча спраў".

Арэнда памяшкання для правядзення з'езда каштавала камуністам 1,5 мільёна рублёў. Як адзначана, у банку на рахунку партыі засталося 700 тысяч рублёў, пры гэтым 30 працэнтаў камуністаў Мінска не плацяць партузносы.

Удзельнікі камуністычнага форуму выказалі меркаванне, што ініцыятарам і арганізатарам нарады камуністычных і рабочых партый павінна стаць кампартыя Кітая. Беларускія камуністы не падтрымліваюць аднаўлення КПСС, а выступаюць за саюз камуністычных партый былых савецкіх рэспублік па тыпу Камінтэрна.

*Дапаможам!*

## Трагічны лёс Каложы

Як многа было створана на беларускай зямлі, і як мала дайшло да нас. Але ўсё ж ёсць сярод гэтай захаванай спадчыны унікальныя бясцэнныя помнікі.

У Гродне на правым беразе Нёмана да сённяшняга дня стаіць пабудаваная каля 1180 года Барысаглебская (Каложская) царква, якую справядліва называюць цудоўным перлам прынёманскага краю.

Пабудаваная ў XII ст. і асвячшоная ў імя святых пакутнікаў Барыса і Глеба, царква вось ужо 8 стагоддзяў падзяляе складаны і багаты гістарычнымі падзеямі лёс беларускага народа. Так, другая назва царквы — Каложская — гэта напамін аб падзеях пачатку XV ст.: у 1405 г. вялікі князь Вітаўт узяў у палон жыхароў прыгарада Пскова-Каложы і пасяліў на тэрыторыі, якая прылягала да Барысаглебскага храма. У канцы XV ст. пры царкве быў створаны манастыр, фундатар якога Богуш Багавіцінавіч — сакратар каралеўскі, атрымаў у 1512 годзе прывілей на ўсе манастырскія землі. На пачатку XVI ст. манастыр нават меў сваю мастацкую школу. У 1609 годзе праваслаўны Барысаглебскі манастыр стаў уніяцкім. У сярэдзіне XVII ст. падчас вайны з Маскоўскай дзяржавай храм быў зноў, як і падчас паходу на Беларусь князя маскоўскага Івана III у пачатку XVI ст., моцна пашкоджаны, а манастыр апустошаны. І толькі пасля 1692 г. архімандрыт Сымон Агурцэвіч "адбудаваў, хаця і не цалкам, спустошаную царкву".

На пачатку XVIII ст. архімандрыт Іасафат Іаахімавіч вырашыў пабудаваць новую царкву, аднак "шмат нарыхтаванай цэглы было адабрана ў яго" на вайсковыя патрэбы і старажытная Каложская царква, на шчасце, не была зруйнавана.

Да 1720 года адносіцца ўспамін аб тым, што абрыў, які паступова размываў Нёман, падышоў да самага храма, што нават прывяло да нязначнага нахілу сцяны. Архімандрыт Каложскага манастыра ордэна базыльянаў доктар багаслоўя Ігнацій Кульчынскі, першы на Беларусі даследчык старажытнасцей, паведамляў, што "царкве пагражае небяспека", і што ў сувязі з гэтым ён і загадаў пабудаваць ля падэшвы гары "агароджу,.. а таксама пасадзіць розныя дрэвы".

Пасля Полацкага сабору 1839 г., ліквідаваўшага уніяцкую царкву на беларускіх землях, Барысаглебскі манастыр быў пераўтвораны ў праваслаўны. А ў 1840 гады ў заходняй сцяне з'явілася небяспечная трэшчына, і ў хуткім часе набажэнствы ў храме прыпыняюцца. У ноч з 1 на 2 красавіка 1853 г. паўднёвая сцяна, частка заходняй сцяны, дах і перакрыцці абваліліся ў Нёман. У канцы XIX ст. быў умацаваны бераг і на месцы абваліўшайся сцяны пастаўлена драўляная.

У 1949 годзе храм як помнік архітэктуры быў перададзены Гродзенскаму гісторыка-археалагічнаму музею. У 1977 годзе Каложская царква стала філіялам Рэспубліканскага музея атэізму і гісторыі рэлігіі. У 80-я гады на Каложы былі праведзены новыя гісторыка-археалагічныя даследаванні і рэстаўрацыйныя работы (аўтар праекта рэстаўрацыі — В.Слюнчанка). Быў перакрыты дах, зроблена адмостка, расчышчаны ад пазнейшых слаёў атынкоўкі сцены...

У 1989 г. храм св.Барыса і св.Глеба быў вернуты Праваслаўнай царкве, перад якой стала цяжкая праблема не толькі заканчэння рэстаўрацыйных работ, але і стварэнне адпаведнага гэтаму храму інтэр'ера.

Высакародная мэта аднаўлення унікальнага храма-помніка — задача не толькі праваслаўных вернікаў, але і ўсёй чалавечай супольнасці і дзяржавы. Толькі аб'яднаўшы нашы сілы мы можам уратаваць гэтае унікальнае стварэнне нашых прашчураў.

Сёння Каложская царква ў небяспецы: фарміруецца новы апоўзень стромага берага Нёмана.

У мэтах захавання і адбудовы Барысаглебскай царквы, што з'яўляецца нацыянальным гонарам беларускай дзяржавы, выканаўчы камітэт Гродзенскага гарадскога Савета народных дэпутатаў стварыў фонд аднаўлення храма і адкрыў рахунак у Гродзенскім філіяле банка "Прыор-Захад" N 701402 код 718 МФО 152101.

Браты і сёстры! Уратуем разам тое, што належыць усім, мінуўшчыне і будучыні!

**Ад імя праўлення Фонда — архіепіскап Гродзенскі і Ваўкавыскі Валянцін, намеснік старшыні Камісіі Вярхоўнага Савета Беларусі па адукацыі, культуры і захаванню гістарычнай спадчыны народны дэпутат Рэспублікі Беларусь Алег ТРУСАЎ, прафесар Сяргей ГАБРУСЕВІЧ, намеснік старшыні Гродзенскага гарвыканкама Алесь МІЛІНКЕВІЧ, дырэктар Гродзенскага дзяржаўнага музея гісторыі рэлігіі Людміла КАРНІЛАВА.**

Камісія па справах ветэранаў і інвалідаў і Сакратарыят Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь выказваюць спачуванне старшыні падкамісіі па справах інвалідаў **Я.Б.Жуковічу** ў сувязі з напаткаўшым яго горам — **смерцю маці.**

НАРОДНАЯ ГАЗЕТА

*Виват, фестиваль!*

# А чем мы хуже Сан-Ремо?

Вопрос, вынесенный в заголовок этой статьи, может показаться не таким уж нахальным, если вспомнить, что в Беларуси уже есть опыт проведения международных фестивалей эстрадной песни. Причем фестивалей весьма респектабельных как с точки зрения широкой организации, так и количества приглашенных звезд.

Но тем не менее до уровня Сан-Ремо мы все-таки не дотягивали, да и что уж там, даже до Сопота или Зеленой Гуры нам было далековато. А мешала в конечном счете провинциальность тех, кто устраивал фестивали. Готовились-то они в Минске, но в последний миг наезжали разбитные люди из Останкино да концертного зала "Россия" и перекраивали все на свой лад. Каждый телередактор протаскивал своего Женю Белоусова, не скрывая, что за это платились немалые деньги, а в конце концов это превращалось в самое заурядное поп-шоу. Ни новых имен, ни соревновательного конкурса — все расписано, все оговорено, все известно заранее. За все уплачено. Из белорусского — только название...

Кстати, вот витебский фестиваль.

Все, сказанное выше, имеет к нему отношение. Пусть и небольшое. Сегодня Игорь Лученок, главный организатор витебского фестиваля, по его словам, очень сожалеет, что передоверил московским и киевским шоуменам. Они внесли в мероприятие чрезмерно высокий градус коммерции, а в итоге существенно снизили его эстетическое значение для культурной жизни республики. А после того, как пришло решение о том, что на фестивале будет доминировать исключительно "фонограммное" исполнение, а другими словами — имитация песен, о каком-то значении витебского фестиваля серьезно говорить трудно. Можно говорить... о каком-то концерте знаменитых артистов, что, в общем-то, интересно, но лежит за рамками фестивального жанра.

А жаль.

У витебского фестиваля были все возможности стать и храмом, и мастерской...

Попытку прорвать рутину, характерную, к сожалению, для нашей эстрадной жизни, делает сегодня фестиваль песни и поэзии, 3 июня открывающийся в Молодечно. Судя по задачам, которые ставят перед собой его организаторы — а это Молодечненский горисполком, Министерство культуры, Государственный эстрадный оркестр, ряд общественных организаций, — у нового фестиваля есть все шансы заявить о себе серьезно и перспективно. Самое главное, пожалуй, заключается в том, что в фестивале смогут принять участие все мало-мальски значительные певцы и музыканты Беларуси. Понятно, что количество обязательно перейдет в качество, и кроме "Счастливого случая", "Сяброў" и "Песняроў" мы наконец сможем обнаружить и новые имена. Заждались!

К фестивалю готовятся и композиторы. Пора, наконец, демократизировать и эту довольно-таки консервативную касту жрецов искусства, очень неохотно расступающуюся, чтобы пропустить вперед кого-то не очень пробивного, но, безусловно, талантливого.

Фестиваль, как мне кажется, поможет многим понять, что белорусская эстрадная песня не есть нечто [illegible], а обладает своим, присущим только ей, своеобразием.

Правда, всем нам этого тоже очень хочется?

Особенно после того, как в течение недели в музыкальных передачах нашего ТВ мелькают одни и те же лица с песнями, похожими друг на друга, как никудышные близнецы-братья. Кстати говоря, и для телевидения это будет очень серьезный экзамен. Редакция музыкальных и развлекательных программ готовится основательно.

Наверняка и зрителям и участникам будет нескучно. Судите сами. Естественно, прозвучат конкурсные песни. Оркестр под управлением Михаила Финберга подготовил интереснейшую ретро-программу. Для молодежи, ценителей крутых ритмов, будут играть рок-команды. Покажут себя самодеятельные фольк-коллективы. И наконец, в Молодечно выступят белорусские поэты. Вот это, пожалуй, будет приятным сюрпризом и придаст фестивалю особое очарование и, несомненно, определенную духоподъемность.

Впрочем, все это пока в планах. Но молодеченский фестиваль не нуждается в конферансе, хотя бы потому, что мы увидим все, что у нас есть в эстрадной песне на сегодняшний день. И хочется надеяться, что есть у нас немало. В том числе и талантов.

Ждать осталось недолго. Подготовка к открытию вступила в решающую фазу. О новостях молодечненского фестиваля мы будем вас информировать.

**Алесь ПАВЛОВИЧ.**

*Спатканне са старадаўнасцю глыбокай*

# Прымі прызнанне ў каханні, святая з Полацку княжна

**У літаратурным творы "Житие Евфросинии Полоцкой" настойліва падкрэсліваецца яе выключная прыгажосць, любоў да асветніцтва і граматы, незвычайная для маладой жанчыны энергія. Дык наколькі ж партрэт Еўфрасінні, напісаны на слупе Спаса-Еўфрасіннеўскай царквы ў Полацку, можна лічыць сапраўдным?**

Доказаў шмат. Фрэскавае адлюстраванне паказвае нам маладую жанчыну чаруючай прыгажосці. Гэтую прыгажосць не адолелі ні стогадовыя трэшчыны тынкоўкі, ні сажа свечак і лампад, ні пыл, ні бясконцыя дакрананні веруючых. Можна зразумець, што Еўфрасіння прыцягвала да сябе розумам і прыгажосцю не толькі багатых людзей, але і просты народ.

Як вынікае з "Жития", на грамадскае поле дзейнасці Еўфрасіння ўступіла ў маладым узросце. З дванаццаці гадоў яна ўжо марыла аб спадвіжніцкім жыцці і настойліва прасіла сваю цётку, удаву князя Рамана Усяслававіча, пастрыгчы яе ў манашкі. Аднак ігумення, спасылаючыся на юнацтва пляменніцы, згоды не давала. І толькі пасля настойлівых, шматразовых просьбаў яна была пастрыжана ў манашкі. На сучаснікаў яе дзейнасць рабіла вялікае ўражанне. Яны ўспрымалі гэта як подзвіг і бачылі за ўсім праяўленне волі Усявышняга.

Вобраз Еўфрасінні поўны ўнутранага гарэння, душэўнай цеплыні, адчуваюцца біццё сэрца, жыццёвая энергія актыўнай валявой асобы. Трэба думаць, аўтар фрэскі быў знаёмы з Еўфрасінняй, інакш наўрад ці здолеў бы напісаць такі жыццёва праўдзівы вобраз манашкі.

Некалькі слоў аб датаванні партрэта. Калі нарадзілася княжна Еўфрасіння Полацкая — невядома. Нам вядомы толькі некаторыя падзеі яе жыцця і дзейнасці. Каля 1159 года па яе загаду быў пабудаваны мураваны Спаса-Еўфрасіннеўскі храм у Полацку. У 1161 годзе для гэтага храма па яе заказу майстрам Лазарам Богшай быў створаны вядомы крыж Еўфрасінні Полацкай. У 1173 годзе яна выпісала з Візантыі Эфескую (Карсунскую) ікону Богамаці і паставіла яе ў храме. Пасля гэтага ўжо ў старым узросце яна адправілася ў Іерусалім, дзе і памерла ў 1173 годзе. У 1187-м яе мошчы былі перавезены ў Кіеў, а ў 1910-м — у Полацк.

На фрэсцы ў Спаса-Еўфрасіннеўскім храме яна намалявана з німбам вакол галавы, г.зн. святой. Але мы не ведаем дакладна, калі Еўфрасіння была кананізавана. Безумоўна, гэта адбылося пасля яе смерці — 1173 года. Відавочна, у канцы XII стагоддзя і быў створаны гэты партрэт.

Мабыць, не трэба і казаць, якое значэнне мае ён для гісторыі беларускай культуры. І справа не ў тым, што ён захаваў да нашага часу вобраз знакамітай культурнай асобы старажытнай Беларусі. Нельга скінуць з рахунку той уплыў, які ён аказаў на ўзнікненне і развіццё партрэтнага жывапісу Беларусі.

**Міхаіл КАЦЭР,**
**прафесар, доктар мастацтвазнаўства.**

# Окажите помощь!

Минским ОВД на транспорте устанавливается личность неизвестного трупа мужчины, обнаруженного 11.05.93 года на перегоне "Помыслище-Роща".

Приметы: на вид 40—45 лет, рост 170—172 см, худощавого телосложения, волос русый с сединой.

Был одет: рубашка белая в полоску черного цвета, майка белая, джинсы варенки, туфли черные.

Минским ОВДТ устанавливается личность неизвестного трупа мужчины, обнаруженного 13.05.93 года в районе ст. Минск-Пассажирский повешенным на дереве.

Его приметы: на вид 30—35 лет, рост 170—175 см, среднего телосложения, волос темно-русый.

Был одет: майка с длинным рукавом, спереди вставка полосами синего, белого цветов, носки серые, туфли коричневые.

Просим граждан, знающих что-либо о неизвестном мужчине, сообщить по телефонам: 27-61-82, 96-30-64, 96-61-63, 96-21-52 в Минский ОВДТ.

*Вокруг спорта*

Швейцарский велосипедист Алекс Зюлле, лидирующий в общем зачете перед пятым этапом гонки по дорогам Испании, уличен в употреблении стимулирующего препарата — сальбутамола, противоастматического средства, включенного, однако, Международной федерацией велоспорта в список запрещенных к применению медикаментов.

❑

Впервые одна из крупных американских телевизионных компаний передаст в Европу "напрямую" весь матч сборных США и Германии по футболу. Эй-би-си будет транслировать эту встречу 13 июня из Чикаго.

❑

Введение профессионального судейства в профессиональных национальных чемпионатах остается важной целью Международной федерации футбола (ФИФА). Заседавшая в Цюрихе (Швейцария) под председательством шотландца Дэвида Уилла комиссия объявила: судья-профессионал может заниматься еще чем-либо, кроме футбола, но основной его профессией должна быть профессия арбитра.

Прокуратура немецкого города Трир выдвинула обвинение против бывшего футболиста национальной сборной Пьера Литтбарски, который только что с помпой распростился с любимой игрой. Чемпион мира-90, которому недавно исполнилось 33 года, по сообщениям немецкой прессы, должен отвечать за бегство с места автомобильной аварии. Литтбарски утром 14 ноября 1992 года на автобане номер 48 вблизи Кобленца попал в аварию и убежал с этого места.

❑

В итальянском футболе — новый скандал. Игроки клуба "Пескара", занимающего последнее место в первой лиге, по слухам, "продали" ряд матчей. Обстоятельства расследуются комиссией при Федерации футбола страны.

❑

Шведская федерация ориентирования отменила запрет на тренировки спортсменов после невыясненных обстоятельств причин смерти 15 ориентировщиков в 1979 году. Правда, запрет на участие спортсменов в соревнованиях пока сохраняется.

❑

Погиб в катастрофе на ультралегком самолете вице-президент немецкого аэроклуба Хорст Дюстерхефт. Он упал в районе Ростока вместе со своим учеником. 42-летний Дюстерхефт, журналист на Среднемецком радио, был опытным пилотом, отвечавшим за развитие авиаспорта на новых федеральных землях, то есть в бывшей ГДР.

❑

В Мехико основан Латиноамериканский совет спорта. Идея слияния в него 18 стран Центральной и Южной Америки, а также Испании родилась во время Олимпиады-92 в Барселоне.

❑

Трехкратный чемпион США по боксу среди любителей Джон Эррера после семимесячного нахождения в коматозном состоянии скончался в госпитале города Корпус Кристи (штат Техас) в возрасте 24 лет. Во время драки с поножовщиной ему нанесли тяжелые ранения ножом в область сердца, легких и селезенки.

❑

Немецкий хоккейный клуб "Кельн" распростился с форвардом из России Равилем Хайдаровым. Об этом сообщил президент команды из бундеслиги Хайнц Ланден, намеревающийся вместо 26-летнего нападающего купить сильного защитника.

❑

Из 3000 тренеров, работающих в Германии с молодежью, по результатам исследования Федеральной комиссии спорта высших достижений, 13 процентов числятся в штате, а 84 проц. полагаются на гонорары. 100 из них нашли работу через биржу труда.

❑

Для подготовки своих спортсменов к Играм содружества-98, которые состоятся в Малайзии, правительство этой страны выделило около 50 миллионов долларов. Из них 15 миллионов пойдут на наем иностранных тренеров. Федерация бадминтона, игроки которой чаще других добивались наград на подобных предыдущих Играх, получит 9 миллионов долларов.

❑

22-летний голкипер минской "Беларуси" Геннадий Тумилович недавно приступил к тренировкам в московском "Спартаке".

❑

Эссенский "Тусем", в составе которого выступает бывший армейский гандболист Александр Тучкин, занял третье место в закончившемся чемпионате германской бундеслиги.

❑

Вполне возможно, что вскоре белорусские футболисты Г.Лесун и А.Сацункевич начнут выступление за клуб "Маккаби" (Израиль, Тель-Авив). Представитель израильского клуба уже провел переговоры в Минске.

**("Народная газета" — ИТАР—ТАСС.)**

*Шашки*

**Интересная задача**
**В.Самарин**



**Белые:** Д. a1, a3, c3, d8, h4, пр. b2, c5, d2, d4, d6 (10)

**Черные:** Д. e1, пр. a5, f4, g7, h6 (5).

**Белые начинают и запирают простую черных**

Предлагаем вниманию любителей композиции задачу борисовского составителя В.Самарина, признанную лучшей в 3-м чемпионате республики по шашечной композиции. Свои решения присылайте по адресу: 220010, Минск, Дом правительства, редакция "Народной газеты", "Шашки".

**Победителей двое — чемпион Виталий Габриелян**

Исключительно сильный состав собрал очередной чемпионат Беларуси по русским шашкам среди мужчин. Среди 24 его участников были неоднократные чемпионы СССР гроссмейстеры Аркадий Плакхин и Виталий Габриелян, известные мастера, победители и призеры всесоюзных и республиканских соревнований. Борьба за золотую медаль чемпиона была необычайно острой. Со старта лидерство удерживал молодой гродненский мастер неоднократный чемпион Беларуси Андрей Валюк, но оторваться от конкурентов ему не удавалось. Все решили финишные туры. В предпоследнем 22-м туре Валюк неожиданно проиграл Виктору Цыдзику из Гродно, что позволило соперникам выйти вперед. В итоге два самых титулованных участника — Виталий Габриелян и Аркадий Плакхин финишировали с одинаковым результатом — по 18,5 очка из 23. По дополнительным показателям золотая медаль была присуждена бывшему бакинцу, а сейчас проживающему в Марьиной Горке, Виталию Габриеляну, который впервые стал чемпионом Беларуси. Серебро досталось минчанину Аркадию Плакхину, а Андрею Валюку пришлось довольствоваться бронзовой наградой с результатом — 18 очков.

Следует отметить успешное выступление минского мастера Владимира Беляевского. Набрав 17,5 очка, он занял четвертое место. На последующих местах мастера Николай Колесников (Бобруйск) — 16 очков и неоднократный чемпион Беларуси минчанин Геннадий Нарчук — 15,5.

*В кинотеатрах Минска*

**1 ИЮНЯ**

**"МОСКВА":** "Все мужчины делают это" — 12.00 (л), 14.00, 16.00, 18.00, 20.00, 22.00 (н).

**"ОКТЯБРЬ":** "Все мужчины делают это" — 13.30 (л), 15.30, 17.30, 19.30, 21.30.

**"АВРОРА":** "Есть идея!"* — 10.00 (беспл. сеанс). "Сказка на ночь" — 11.30 (л), 15.30, 19.20, 21.00. "Дьяволица" — 13.30, 17.30. "Роковая красотка" — 15.00, 17.00, 19.00, 20.50.

**"БЕРЕСТЬЕ":** "Бесконечная история" — 10.00. "Тридцатого" — уничтожить!" — 12.00 (л), 16.00, 19.30, 21.00. "Железный орел" — 14.00, 18.00, 21.30. "Жикина династия"-II" — 15.00, 19.00. "Московская любовь" — 13.00, 17.00.

**"ВИЛЬНЮС":** Мультфильмы* — 10.30. "... по прозвищу "Зверь" (ф. 1-й) — 15.30. "Тридцатого" — уничтожить!" (ф. 2-й) — 14.00, 17.20, 20.30. "Роковая красотка" (в гл. роли Вупи Голдберг, любимица Америки) — 12.10, 18.40, 21.50. Видеозал: 11.00, 13.20, 15.25, 17.30, 19.35, 21.40. Информационно-развлекательная программа — 21.00.

**"ДРУЖБА":** "Тридцатого" — уничтожить!" — 11.30 (л), 14.50, 18.10, 21.50. "Роковая красотка" — 13.00, 16.20, 20.00. Видеозал: "Деньги: еще деньги" (комедия, в гл. роли М.Джексон) — 15.00. "Ракетчик" (фантастика) — 16.40, 18.20.

**"ПАРТИЗАН":** "Все мужчины делают это" — 14.30, 16.15, 18.00, 19.45, 21.30.

**"ПОБЕДА":** "Роковая красотка" — 11.30, 15.10, 18.40, 20.40. "Тридцатого" — уничтожить!" — 10.00 (л), 13.25, 17.10. Видеозал: "Пассажир №57" (полицейский боевик, США) — 10.00, 11.45, 13.35, 15.15, 17.05, 18.45, 20.35. Видеосалон, видеокафе: "Нико-3" — 11.10. "Нико-4" — 13.30. С 16.00 видеокафе работает без демонстрации фильмов.

**"САЛЮТ":** "Все мужчины делают это" — 12.00, 15.30, 17.20, 19.10, 21.00. "Цонинг" — 13.50.

**"СОВРЕМЕННИК":** "Железный орел" — 15.00 (л). "Тридцатого" — уничтожить!" — 16.30, 19.40. "Империя чувств" — 18.00, 21.00.

